08.55, 05.15, 05.40 Невероятные изобретения
09.20, 03.30 Охотники за мифами
10.15, 11.15 Отчаянные дегустаторы отправляются
12.20, 13.10, 14.00, 14.50, 15.40 Заговор
16.30, 22.00 Большие ожидания
17.35 Женщины эпохи Реставрации
18.45, 19.50, 20.55 О любви британцев к танцам
23.00 Изгнанники
00.00 Величайшие мистификации в истории
00.50 Лучшие убийцы древних времён
01.40 Спецназ древнего мира
02.35 Секретные операции
04.25 Тени средневековья

ТВ 21

10.00, 18.00, 02.00 Братья Карамазовы
10.50, 18.50, 02.50 Сексоголик
12.25, 20.25, 04.25 Красные башмачки
14.45, 22.45, 06.45 Север
16.05, 00.05, 08.05 Открытые сердца

ТВ 1000

06.10, 18.15 Одноклассники
08.00 Госпожа горничная
09.55 Тихая гавань
11.55 Ничего личного
14.10 Лофт
16.05 Власть страха
20.10 Обитель проклятых
22.10 Воспоминания о будущем
00.30 Как поймать монстра
02.15 Коматозники
04.10 Джо

ТВ 1000 Русское кино

06.20 Весь этот джем
08.15 Пятница
09.50 Родина
12.05 Десять негритят
14.30 Всё и сразу
16.15 Край
18.25 Любовь напрокат
20.20 На крючке
22.10 Иерей-сан
00.10 Про любоff
02.20 Благословите женщину
04.35 Папа

РЕТРоТВ

06.00, 12.00 «Место встречи изменить нельзя»
07.15 «Песни войны в исполнении Людмилы Гурченко»
07.50 Бенефис Людмилы Гурченко
09.05 Моя морячка
10.25 Утренняя почта
11.00 Дорз: Концерт в Европе. Фильм-концерт
13.25 «Встречи для Вас. Виктор Павлов»
14.05, 15.50 «Ревизор»
17.10 «Бенефис Веры Васильевой»
18.00 Дискотека 80-х
20.30 Большое ограбление поезда
20.40 Шерлок младший
21.25 Джазовый концерт «Американский биг-бэнд»
00.00, 01.25 «Следствие ведут ЗнаТоКи. Дело № 17 «Он где-то здесь»
02.55 Весь я
04.25 Человек с дождем в ботинках

ВТВ

06.00, 23.00, 04.00 «6 КАДРОВ»
07.00 «МИЯ И Я»
07.30 «ЕРАЛАШ»
08.30 «ТРИ КОТА»
08.35 «ЙОКО»
08.50 «ПРИКЛЮЧЕНИЯ ДИНО»
09.10 «ФИКСИКИ»
09.20 «МАШИНЫ СКАЗКИ»
09.25 «МАША И МЕДВЕДЬ»
09.30 «АЛИСА ЗНАЕТ, ЧТО ДЕЛАТЬ»
10.00 «ОСТОРОЖНО: ДЕТИ!»
10.30 «ПАПИНЫ ДОЧКИ»
11.30, 00.50 «ТУРБО МИКСЕР»
12.00 «УСПЕТЬ ЗА 24 ЧАСА»
13.00 «ОТЕЛЬ ЭЛЕОН»
15.30 «БУЛЬ И БИЛЛ»
17.10 «ПРИКЛЮЧЕНИЯ МИСТЕРА ПИБОДИ И ШЕРМАНА»
19.00 «УРАЛЬСКИЕ ПЕЛЬМЕНИ»
21.00 «ВОЙНА БОГОВ: БЕССМЕРТНЫЕ»
00.00 ЕВРОПЕЙСКИЙ ПОКЕРНЫЙ ТУРНИР
04.30 «ЛОВИ МОМЕНТ»
05.00 «ЯСНОВИДЯЩАЯ»

RTVi

06.00, 06.30 Русский акцент
07.00 Израиль за неделю
08.00 Особое мнение
08.40 «ОХ УЖ ЭТА НАСТЯ»
10.00 «ТАМ НА НЕВЕДОМЫХ ДОРОЖКАХ»
11.15 «НЕВИННЫЕ СОЗДАНИЯ»
12.45 «ПОСЛЕДНЯЯ ДВОЙКА»
14.00 «ЖИЗНЬ НА ДВОИХ»
15.30 «ПУТЕШЕСТВИЕ ВО ВЛЮБЛЕННОСТЬ»
17.15 «ЧУДЕСА В РЕШЕТОВЕ»
19.00 В Нью-Йорке с В. Топаллером
20.00 Новости RTVi
20.30 Непрямой эфир
21.00, 00.30 «О, СЧАСТЛИВЧИК!»
22.45, 03.45 «СТАЯ»
02.15, 02.45, 03.15, 05.30 Американский ликбез

Animal Planet

06.00, 05.36 Школа горилл
06.25, 19.10 Ветеринар Аляски
07.15, 21.00 Дома на деревьях
08.10, 20.05 Будни ветеринара
09.05, 17.20 Перед лицом опасности
10.00 Опасная Южная Африка
10.55, 11.20 Сроднившиеся с обезьянами
11.50, 23.45 Человек, гепард, природа
12.45, 13.40, 14.35, 15.30, 16.25, 00.40, 01.35, 02.25, 03.15, 04.02 Необычные животные Ника Бейкера
18.15 Ветеринар Роки-Маунтин
21.55, 22.50 Укротители аллигаторов
04.49 Логово гигантов

Sci-Fi

06.00, 13.35, 05.35 Спросони
08.10, 08.55, 15.45, 16.30, 17.15, 18.00, 18.45, 19.30, 20.15 Флэш
09.40, 10.30, 11.20, 12.05, 12.50 Звездные врата
21.00, 21.45, 22.30, 23.15, 00.00 Сотня
00.45, 01.40 Декстер
02.35, 03.20 Библиотекари
04.05, 04.50 Оборотень

Белсат

07.00, 21.00, 00.35 Аб'ектыў
07.15 ПраСвет
07.50 Гісторыя пад знакам Пагоні
07.55 Фільм са страшнаю назваю
08.05 Дзіўны свет ката Філімона
08.15 Прыгоды ката Філімона
08.25 Між намі, бусламі
08.50 Пінгвінік Пік-Пок
09.00 Таямніца Саґалі
09.25 Першыя змагарныя гады незалежнасці
09.45 Рэпартэр
10.05 Над Нёмнам
10.20 Зона «Свабоды»
10.55 Маю права
11.20 Форум
12.05 Людскія справы
12.35 Наваградскія замкі
12.55 Дзе знайсці матывацыю беларускаму пенсіянеру
13.20, 21.15 Belsat Music LIVE
13.45 Праз вечнасць
15.05, 23.50 Пракурор
15.50 Наркагандаль
18.15 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча
18.45 Зімовыя хваробы
19.05 «Жэстачайшы»
19.30 Партрэт
20.10 Горад затопленых багоў
21.40 «Вівіен Амсалем хоча развесціся»
21.55 Вівіен Амсалем хоча развесціся
00.50 Адна вайна
02.15 Перапынак у трансляцыі

Голос В. Кипелова	Др.-греч. философ	Луговое растение	Крестный отец	Скользкая площадка

Музыкальный инструмент	Монах	Корм для скота	Фантастический напиток	Пахарь в ярме	Крюк на суднах	Белый медведь	Электричество

Анекдоты

☺ ☺ ☺

Невест обычно любят больше жён. Поэтому многие мужчины не хотят жениться.

☺ ☺ ☺

Самое большое преимущество любовницы заключается в том, что с ней можно поговорить о недостатках жены. Попробуйте поговорить с женой о недостатках любовницы.

☺ ☺ ☺

Навальный сказал, что судебные сроки давности в политике должны быть отменены.

Интересно, он декабристам срок прибавит или, наоборот, их оправдает?

☺ ☺ ☺

Гид-переводчик водит по Питеру группу туристов из Европы.

— А там вы видите наш новый стадион в форме летающей тарелки. Он называется Зенит-Арена и стоит миллиард евро... Нет, мадам, летать он не может... Даже за такие деньги.

☺ ☺ ☺

Всему миру уже давно пора понять — если ваши проблемы из-за России, то это ваши проблемы.

Каким гриппом в этом сезоне могут заболеть белорусы

В Беларуси низкий уровень заболеваемости ОРВИ, в том числе гриппом. Сезонный подъем медики ожидают к концу января — началу февраля. Специалисты надеются, что из-за высокого уровня вакцинации населения и в этом году эпидемии у нас не будет.

Как отличить грипп от другой вирусной инфекции



	Другие ОРВИ	Грипп	Свиной грипп
Симптомы	Начинается насморк, появляется боль в горле и зеве, кашель. Температуры может не быть, она может повыситься сразу или через несколько дней.	Резко поднимается температура, начинается интоксикация, светобоязнь, боли в костях, мышцах, постепенно усиливается сухой кашель, начинается слезотечение, примерно на третий день начинается насморк.	Такие же симптомы, как и у обычного гриппа.
Инкубационный период	1-5 дней.	От нескольких часов до двух дней.	От нескольких часов до двух дней.
Лечение	В зависимости от симптомов.	При тяжелом течении: специальные противовирусные препараты озельтамивира с торговыми названиями «Флустоп» и «Тамифлю».	Специальные противовирусные препараты озельтамивира с торговыми названиями «Флустоп» и «Тамифлю».
Осложнения	Бронхит, синусит, отит, пневмония.	Чаще всего бактериальная пневмония.	Чаще всего вирусная пневмония.

TUT.BY

Сейчас белорусы в основном болеют аденовирусами, риновирусами, респираторно-синцитиальным вирусом. Специалисты регистрируют единичные случаи гриппа. По словам Инны Карабан, заместителя начальника отдела гигиены, эпидемиологии и профилактики Минздрава, уровень заболеваемости на данный момент низкий.

— Подъем гриппозной заболеваемости ожидаем, как обычно, к концу января — началу февраля. Но учитывая, что вакцинировано около 41% населения, надеемся, что у нас эпидемии гриппа не будет, — отмечает специалист.

Именно благодаря вакцинации эпидемии гриппа в Беларуси не было в прошлом и позапрошлом годах. В прошлом году прививку от гриппа сделали около 42% белорусов. По словам Инны Карабан, в этом году люди чаще прививались за счет предприятий, чем своих средств.

Какие именно штаммы гриппа будут преобладать в этом сезоне, говорить рано. Конкретные выводы можно сделать, когда начнут регистрировать достаточное для аналитики количество случаев заболевания. Тем не менее в этом сезоне медики ожидают циркуляцию четырех штаммов вируса гриппа: группы А (пандемического или свиного H1N1 и гонконгского H3N2) и группы В (линий Ямагата и Виктория).

По словам собеседницы, прививка защищает от вышеперечисленных вирусов, так как штаммы вирусов в вакцинах обновляются ежегодно.

— Анализ данных делают на основании информации по заболеваемости в Южном полушарии для Северного полушария, и наоборот. Ошибочные предсказания по составу вакцины бывают очень редко, — объясняет Инна Карабан.

Самый лучший период для вакцинации — октябрь-ноябрь, но сделать прививку можно было и до середины декабря. Иммунитет вырабатывается в течение двух-четырех недель.

Минздрав будет передавать в налоговую данные о безработных пациентах только с их согласия

Минздрав разослал в медучреждения письмо о том, как правильно передавать в налоговую данные о тунеядцах. Этот вопрос обсуждался на специальном совещании в конце прошлого года, текст письма размещен на сайте Минздрава. В частности, там сказано, что передавать данные можно только с письменного согласия граждан.

Как говорят в Минздраве, на совещании госорганы договорились «о необходимости снятия социальной напряженности по вопросам реализации норм декрета №3». Речь идет о том, чтобы исключить необоснованные требования по уплате сбора на финансирование госрасходов к тем гражданам, которые не работали, но в 2015 году перенесли «определенные заболевания (травмы), а также к женщинам, состоявшим под медицинским наблюдением во время беременности, родов и в послеродовой период».

В своем письме Минздрав поручил предоставлять таким гражданам выписки из медицинских документов установленной формы, а также эпикриза медицинской карты стационарного пациента (его дубликата), подтверждающего конкретный период оказания медицинской помощи в стационарных условиях.

При этом в письме Минздрава уточняется, что при оформлении выписки из медицинских документов указание диагноза не требуется.

Однако самым важным является то, что теперь «с целью соблюдения врачебной тайны» медучреждения будут предоставлять налоговым данные о безработных только с их письменного согласия. Оригинал письменного согласия должен быть приложен к запросу налоговой.

FINANCE.TUT.BY

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

ЗАГЛЯНЕМ У СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

Жывая памяць пра продкаў

Фотаздымкі свайго прапрадзядулі і сваёй прабабулі сланімчанка Даша Праўдзіцкая прынесла, калі разам з бабуляй Люцыяй Палуянцэвіч прыйшла па выйгрыш у конкурсе красвордаў.

Іван Будрэвіч (злева)

На фотаздымку 1922 года — прапрадзядуля Дашы Іван Будрэвіч у форме салдата польскай арміі. Ён нарадзіўся ў 1898 годзе. У апошнія гады Іван Антонавіч працаваў на мэблевай фабрыцы вартаўніком, а ў маладосці быў заможным мешчанінам, меў сваю гаспадарку. Карэнны слонімец, ён жыў на вуліцах Карла Маркса, Сінічкіна і Падгорнай. Яго не стала ў 1984 годзе.

Казіміра Будрэвіч (другая злева) разам з калегамі, 1958 год

На другім здымку, датаваным 1958 годам, — прабабуля Дашы і нявестка Івана Антонавіча Казіміра Будрэвіч разам з калегамі. Фотаздымак зроблены перад парадам 7 лістапада. Казіміра Баляславаўна працавала ў «Світанку» бухгалтарам, а пасля начальнікам групы ўліку баз і складоў.

Фотапаштоўка з выявай скульптуры на тэрыторыі касцёла ў цэнтры Слоніма

Зберагаецца ў сям`і і старая фотапаштоўка касцёла Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі, зробленая яшчэ за польскім часам.

Жанна ІВАНОВА

Барацьба за Слонім у час польска-савецкай вайны

ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК У №2

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Падрыхтоўка савецкай аперацыі па авалоданні Слонімам

Толькі пасля страты Слоніма савецкае камандаванне прыйшло да разумення яго важнасці і распачало падрыхтоўку аперацыі па яго вяртанні. Месцам збору часцей для будучага наступлення вызначылі вёску Палонка ў ваколіцах Баранавічаў. Палякі добра ведалі пра падрыхтоўку бальшавікоў, дзякуючы ўдалым дзеянням свайго разведатрада пад кіраўніцтвам паручніка Каміньскага.

Гарнізон Слоніма ўмацоўваўся дадатковымі сіламі, у першую чаргу дзвюма ротамі, сфарміраванымі ў Ваўкавыску і Зэльве, а таксама адной ротай Ковенскага палка. Ужо з пачаткам баявых дзеянняў з Беластока да Зэльвы чыгункай, а далей на Слонім маршам 9 сакавіка перакідваецца 3-я рота 79-га стралковага палка, якую ўзначальваў падпаручнік Краеўскі.

Для атакі на Слонім бальшавікі задзейнічалі полк матросаў (каля 1500 чалавек) і «батальён смерці» 4-га варшаўскага пяхотнага палка (каля 600 чалавек).

Другая бітва за Слонім (8-12 сакавіка 1919 года)

Раніцай **8 сакавіка** пад прыкрыццём двух бронеаўтамабіляў савецкія часці пачалі наступ на Слонім. План заключаўся ў тым, каб адначасовым ударам па мастах і пераправах праз Шчару вымусіць палякаў расцягнуць іх сілы, дасягнуць поспеху ў адным з месцаў і пераправіцца на левы бераг ракі. Але не быў улічаны колькасны склад праціўніка, які пераўзыходзіў наступаючых, а таксама яго забяспечанасць артылерыяй і кулямётамі.

Двойчы савецкія часці спрабавалі авалодаць мастамі праз Шчару ў Слоніме. Бой працягваўся да трох гадзін ночы, і толькі пасля ўмяшальніцтва штабной роты пад кіраўніцтвам паручніка Антанеўскага палякі здолелі адціснуць бальшавікоў на ранейшыя пазіцыі.

Пэўны поспех Саветы мелі пад Шылавічамі, дзе пад прыкрыццём артылерыі і мінамётаў наступалі на пазіцыі Віленскага палка, здолеўшы авалодаць пераправай. Але з надыходам ночы і перакідваннем пад Шылавічы ўзвода артылерыі паручніка Ружаньскага і кулямётаў бальшавікі спынілі далейшы рух. У сваіх паведамленнях палякі адзначалі: «У бітве 8 сакавіка ў Слоніме прымала ўдзел жыдоўскае насельніцтва, якое з дамоў закідвала нашых жаўнераў ручнымі гранатамі і страляла ў іх». З надыходам ночы палякі замініравалі і забарыкадзіравалі слонімскія масты.

9 сакавіка злучэнні Чырвонай Арміі аднавілі наступленне адразу ў некалькіх месцах, выціскаючы палякаў. Але тут жа арганізоўваліся контратакі, у якіх вызначыліся паручнік Корсак і падпаручнік Хэпнер, адзначаныя за абарону Слоніма ордэнам Virtuti Militari 5-га класа. Бой працягваўся да надыходу ночы.

У 18 гадзін савецкія часці скарысталіся зменай дзвюх рот на Замосці, якую праводзілі палякі, і захапілі пераправу. Паручнік Корсак, які ў той час абараняў другі слонімскі мост, пачуў хаатычную страляніну і крыкі «ўра!» на левым флангу. Ён на чале часткі салдат сваёй роты пайшоў на ратаванне адступаючых, якіх затрымаў і нават павёў у контратаку. У выніку палякі здолелі зноў захапіць пераправу.

Але ў гэты самы час савецкая пяхота атакавала іншую пераправу, якую абараняў падпаручнік Хепнер з рэштаю 1-й роты. Абарона праціўніка была прарваная, і савецкія салдаты перабраліся на левы бераг Шчары. Але патрапілі ў пастку, арганізаваную палякамі ў вузкіх вулачках горада. Іх закідвалі гранатамі і расстрэльвалі, а пасля штыкавой атакі выціснулі на правы бераг.

Дзякуючы рашучасці паручніка Корсака становішча на левым флангу 86-га Мінскага палка было адноўлена.

У гэты ж час на правым флангу бальшавікі перайшлі па лёдзе Шчару і разбілі 3-ю і 5-ю роты Мінскага палка. Толькі дзякуючы вялікім стратам, умяшальніцтву 4-й роты паручніка Дубіньскага і атраду гродзенскіх уланаў паручніка Чучэловіча, які падышоў з Жыровічаў, савецкія часці былі адбітыя за раку. Усю ноч працягваліся спробы авалодаць пераправамі.

З-за недахопу мундзіраў у Польскім войску здараліся выпадкі, калі пад Слонімам палякі забівалі або ранілі сваіх жа салдат.

10 сакавіка савецкія часці сканцэнтраваліся на наступленні праз пераправу ў Шылавічах, якое пачалося ў 5.30. Пэўным поспехам стаў захоп аднаго кулямёта і выціскане польскіх разведчасцей на левабярэжжа Шчары.

Частка савецкіх сіл пад прыкрыццём лясоў прасунулася аж да балот у ваколіцах Слоніма з паўночнага ўсходу і ўвайшла ў горад. Палякі вымушаныя былі задзейнічаць часці 79-га Беластоцкага палка, які пасля двухразовай контратакі вярнулі захоплены мост: узвод станковых кулямётаў, які меўся пры 1-й роце Мінскага стралковага палка, адбіваў гвалтоўную атаку трох бальшавіцкіх рот, якія ішлі вуліцай на штурм. 3-і ўзвод 3-й роты Беластоцкага стралковага палка падтрымліваў контратаку бакавым агнём з боку чыгункі і не дазволіў Саветам перакінуць свае сілы праз мост.

У 13.00 1-ы ўзвод Мінскага стралковага палка разам з 3-й ротай і ўзводам станковых кулямётаў Беластоцкага стралковага палка рушылі на штурм і занялі другі мост на рацэ Шчары. Савецкія аддзелы пасля трохгадзіннай бітвы былі вымушаныя адступіць са Слоніма.

Апоўначы з **10** на **11 сакавіка** савецкія часці, фарсіраваўшы адзін з мастоў, увайшлі ў горад. Бой на вуліцах Слоніма доўжыўся пяць гадзін. Пасля штыкавога бою бальшавікі вымушаныя былі адступіць на старыя пазіцыі за Шчару.

Увесь дзень левы бераг Шчары абстрэльвалі шрапнэллю. Толькі пасля таго, як пад градам куляў узводны 3-й роты Віленскага палка Якім Гірач падпаліў мост пад Добрым Борам, бальшавікі вымушаныя былі адступіць, пакінуўшы сем трупаў.

У Кальчоўніцах праз мост удалося прарвацца адной савецкай роце з кулямётамі, у далейшым яны адступілі да вёскі Доўгая.

12 сакавіка пачаўся апошні штурм польскіх пазіцый у Слоніме, пры падтрымцы артылерыі і бронеаўтамабіляў. Саветам удалося артылерыяй знішчыць два кулямёты на адным з мастоў і чарговы раз увайсці ў горад. Але сустрэтыя моцным агнём 1-й роты Мінскага палка паручніка Корсака, пасля паўгадзіннага штыкавога бою яны былі выціснутыя. У 11 гадзін штурм аднавілі, у чарговы раз перабраўшыся на левы бераг Шчары. Чатыры гадзіны працягваўся бой у горадзе, але палякі за кошт рэзерваў здолелі нанесці Саветам паражэнне. Толькі пасля гэтага бою ў палон патрапіла 60 чалавек.

Усяго палякі за час бою ў Слоніме 8-12 сакавіка захапілі 120 салдат Чырвонай Арміі. Савецкія злучэнні, панёсшы вялікія страты, вымушаныя былі адысці да Баранавічаў.

Польскія страты таксама былі значнымі. У абароне Слоніма толькі 1-ы батальён Мінскага стралковага палка страціў 47 забітымі і параненымі. Кіраўнік дывізіі, генерал Івашкевіч, за абарону Слоніма дараваў мінскаму палку «высокую жаўнерскую хвалу і падзяку за ахвярную працу і пралітую сардэчную кроў».

У сакавіку і першай палове красавіка палякі працягвалі ўмоўвацца ў Слоніме, праводзілі трэніроўкі і рыхтаваліся да наступлення на Баранавічы.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

ХОККЕЙ

ФОТО «АМАТАРСКАЯ ХАКЕЙНАЯ ЛІГА»

Играют ХК «Леон» и ХК «Волот», 15.01.17

Слонимский «Леон» одержал победу над пинским «Волотом»

Как львы сражались хоккеисты слонимского «Леона» с пинским «Волотом» в матче, который прошел 15 января в Ивацевичах. В итоге слонимчане победили со счетом 13:8.

Больше всего шайб — четыре — в ворота соперников забил Сергей Головинов (№7 ХК «Леон») и по три каждый — Ян Метечко (№17 ХК «Леон»), Алексей Тряскин (№5 ХК «Леон»), Дмитрий Едешко (№2 ХК «Леон»).

Не остались в долгу и соперники «Леона», которые достойно держали оборону. Ворота слонимчан пять раз пробил Денис Курцевич (№44 ХК «Волот»), дважды Евгений Романов (№27 ХК «Волот») и один раз Юрий Лейфман (№43 ХК «Волот»).

Ольга ШИНКЕВИЧ

НОВОСТИ

СПОРТСМЕН ИЗ СЕЛЯВИЧЕЙ СТАЛ ПРИЗЁРОМ ОБЛАСТНЫХ СОРЕВНОВАНИЙ

ФОТО ИЗ ЛИЧНОГО АРХИВА АНДРЕЯ КИРИЧКО

Девятиклассник Андрей Киричко, ученик Селявичской школы, занял третье место среди юношей в личном первенстве по лыжным гонкам.

Он принял участие в соревнованиях в рамках спартакиады Гродненской области "Золотой колос". Как отметил тренер бронзового призёра Игорь Серкевич, Андрей к соревнованиям готовился с начала зимнего сезона, ежедневно бегал на лыжах по заснеженным полям и лесам.

Татьяна ПЛАХЕТКО

ФУТБОЛ

Футбольные фанаты со всей Беларуси отыграли турнир

Слонимская команда болельщиков

Шесть команд фанатов футбола со всей страны сошлись в битве за первое место в турнире, который прошёл в Слониме 14 января.

«Инициатива проведения такого мероприятия пошла от слонимских болельщиков, они одни из самых активных в первой лиге, — рассказывает пресс-секретарь футбольного клуба «Слоним» Александр Бурак. — Идею турнира поддержал Слонимский райисполком в лице заместителя начальника отдела образования, спорта и туризма Валерия Сидорчика».

Футбольные фанаты из Слонима, Гродно («Неман»), Барановичей, Минска («Торпедо-Минск»), Молодечно, Лиды были разделены на две группы по три команды.

Матчи длились пять часов. В итоге в упорной борьбы первое место заняла команда Лиды, на втором месте — Гродно, на третьем — Слоним.

Команда Барановичей получила приз за лучшую речевку.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ФОТО АВТОРА

ВЗГЛЯД

Кто из футболистов ФК «Слоним» мог бы стать моделью?

На днях на просмотр в брестское «Динамо» прибыл вратарь из Франции Жереми Малерб. Француз — большая редкость в нашем чемпионате (до этого играл лишь Орельен Монтаруп в минском «Динамо» с 2008 по 2012 год). В диковинку и то, что Жереми Малерб является фотомоделью.

Вратарь-легионер-модель может стать одной из заметных фигур в нашем чемпионате, даже не показывая выдающейся игры. Да и многие современные футболисты являются теми еще модниками (лавры Дэвида Бекхэма и Криштиану Роналду, видимо, не дают им покоя).

А кто же из футболистов, игравших в 2016 году за ФК «Слоним», мог бы попробовать себя в роли модели и составить конкуренцию французу Жереми Малербу?

В качестве независимого эксперта в этом вопросе выступила слонимчанка, внештатная корреспондентка «ГС» Лиза Шот. Лиза отобрала топ-3 футболистов, выходивших в 2016 году в составе слонимчан, которые могли бы себя попробовать в качестве модели. Для отбора были использованы профили футболистов ВКонтакте.

3. Илья Пацевич

— Илья Пацевич, думаю, смог бы стать моделью. Хотя модельного в нем вроде и немного, но он симпатичный. Думаю, ему стоит попробовать себя в модельном бизнесе.

2. Сергей Подрецкий

— У этого футболиста очень приятные черты, мужественные, и сексуальный он. Хотя фотографий в ВК немного и их качество не очень... Но если с футболом не получится, то, думаю, он может попробовать поискать себе работу в модельной сфере. Может, что и выйдет.

1. Александр Красий

— Вот этот, по-моему, идеально подходит. Очень красивый парень. Лицо, рост, стать — все как надо. По моему мнению, Александр Красий — 100% потенциальная модель.

Никита ПАСТУХОВ

ПАЭЗІЯ

Валасы твае як лён...

Уладзімір Лабко

Дзераўная... Чаму так?

Лета. Жнівень.
У небе зоры,
Месяц іх у коўш збірае.
Дзе ёсць гэткія
прасторы?! —
Я на свеце больш не знаю.
Дзве рачулкі, быццам рукі,
Маю вёску абдымаюць.
Не пражыць мне без дакукі
Па маім, па родным краі,
Без лясоў, лугоў і пожняў,
Без крыніц, што
серабрацца.
Успамінаю іх дзень кожны,
Не магу не хвалявацца
За мой край, дзе я радзіўся,
Дзе з сябрамі пас гавяду,
Маім краем ганарыўся...
Чаму ж ён у заняпадзе?
На свой запыт толькі чую:
«А нас гэта не хвалюе».

Беларусачка

Сонца раніцай ўстае,
Ночку разганяе.
А пагляд тваіх вачэй
Ярчэй за сонца ззяе.
Валасы твае як лён,
На губах мак свеціць,
Вочы быццам лазурыт —
Найсіней на свеце.
Дзе, скажы, якой вады
Трэ было напіцца,
Каб прыгожаю такой,
Як ты, нарадзіцца?
Тут адказ ураз дала
Мне наша прырода:
— Бач, крынічка вунь цячэ
Міма агарода,
І жанчыны з яе п`юць
Чыстую вадзіцу,
Каб прыгожымі маглі
Дочкі нарадзіцца.

Карыя вочы

Каб я лепш да цябе
не хадзіў,
У вочы карыя
не ўглядаўся...
Час ішоў, я цябе быў забыў,
А сустрэў — і наноў
закахаўся.
Адзінокай сцяжынай іду,
А твой вобраз ўстае
прада мною
Мне на радасць ці мо
на бяду —
Я ўжо болей не маю
спакою.
Сэрца ныя, душа ж зіхаціць
Ад таго, што з табою
сустрэўся.
Я не знаю, як далей
мне жыць,
Куды сёння мой розум
падзеўся?
Разумею, што нашы гады
Не ідуць між сабой
ў параўнанне,
Разумею, што не малады,
Толькі паліць мне сэрца
каханне.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Чырвоныя пацеркі

Цяжка было прадзірацца праз зараснік маліннику, але маленькая Алеська ўпарта шылася ў самы далёкі куток сада, бо тут яе ніхто не ўбачыць. Села на сагрэтую чэрвеньскім сонцам траву і горка заплакала. Спачатку ціха, а потым наўзрыд.

— Чаго ты, Алеська? — пачуўся з-за плоту голас Сцяпанкі Кузьміцкага, з якім яны сёлета закончылі першы клас і вельмі сябравалі. Дзяўчынка з-за слёз не магла гаварыць. Яна выцірала вочы худымі мурзатымі кулачкамі, час ад часу закладваючы за вушы пасмы густых русых валасоў.

— Пачакай, я зараз пералезу, і ты ўсё раскажаш. — Ён пабег уздоўж плоту да таго месца, дзе была адарвана адна ляска, прасунуўся ў дзірку.

— Цябе зноў білі? — спагадліва зірнуў чорнымі, як ноч, вачамі.

— Не-а, — пахістала галоўкай Алеська. — Яшчэ горш. Татка ездзіў у горад і купіў мачысе чорную сукенку і чырвоныя, як рабіна, пацеркі. А мне — ні-чога! А ў мяне ўжо даўно сандалі падраліся, — яна выцягнула з-пад сябе ножку і паказала сандалік з напалову адарванай падэшвай. — Во! І сукенку прасіла, бо гэта паліняла, і падолак адарваўся. Я сама зашыла.

— Не плач! Як я вырасту, то куплю табе шмат прыгожых сандаляў і сукенак. — На смуглым тварыку хлопчыка была спагада.

— Чаму я не згадзілася жыць з бабуляй Мірай у Зацішанцах?! — у голасе Алеські была роспач. — Яна так угаворвала, а я не захацела... Бо тут жа ты, а ў Зацішанцах у мяне няма сяброў. І ў школу трэба хадзіць другую... Дзяўчынка прыціхла, але ненадоўга: — І навошта мая мамачка памерла, а мачыха Света трапілася такая злая, усё адно як баба-яга? Мабыць, добрых мачых не бывае. Праўда, Сцяпанка?

— Я не ведаю... Але такой нялюдскай, як у цябе, напэўна, няма ва ўсім свеце. Так і мая мама казала: «Ці патрэбна была Раману Дарашкевічу гэтая Светка? Дзяўчынку зусім не шкадуе, б`е, а ён нібыта і не заўважае. Усе ў нашай вёсцы Скадорвы гэтым абураны».

Памаўчалі.

— Мяне сёння зноў будуць біць, — са страхам сказала Алеська. — Пасля полудня, як татка з мачыхай ішлі на работу, мне загадалі пільнаваць куранят, каб у грады не лезлі, а я гуляла і забылася... Мне трэба да бабулі ісці ў Зацішанцы. Яна мама маёй мамачкі, яна мяне вельмі любіць і шкадуе.

— І праўда, трэба. Толькі чаму пешшу? Туды ж аўтобус кожны дзень ходзіць. І заўтра будзе ў дзесяць гадзін раніцы. Я ведаю... Пакуль твой татка ды мачыха на рабоце, ты і паедзеш.

— У мяне грошай на білет няма...

— Такіх малых, як мы, задарма возяць. А хочаш, я сваю капілку разаб`ю і грошы табе аддам? Калі не на білет, то няхай у цябе будуць свае грошы.

— Дзякуй, Сцяпанка!

— А ведаеш што, давай тваёй мачысе адпомсцім за ўсё!

— Як?

— Пацеркі парвем... О, я прыдумаў! Не проста парвем, а возьмем клей і прыклеім да той сукенкі, што купіў татка.

— Здорава!

— Ага, і напішам: «Баба-яга» — ды выкладзем словы пацеркамі.

Крэйду знайсці — не праблема, а пісаць яны ўмелі. Калі парвалі нітку і пацеркі рассыпаліся па канапе, Сцяпанка сказаў:

— Ой, не хопіць нам на два словы, малавата пацерак.

— Нічога, пішы проста: «Яга». Зразумела, што баба. Напішы, а я буду мачаць пацеркі ў клей і ляпіць.

— Памылка! — спахапіўся Сцяпанка. — Трэба ж Яга пісаць з вялікай літары...

— Яе ды з вялікай літары?! Такога злыдня?! Ды з саменькай малюсенькай яе трэба напісаць!

— Ладна... Вялікую закрэслю, а напішу маленькую. Толькі, можа, пацеркі трымацца не будуць. Ці добры ў вас клей?

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Алеська выскачыла з пакоя і праз пару хвілін вярнулася з цюбікам.

— Во, яшчэ які добры! Татка яго на мінулым тыдні з горада прывёз, каб нешта заклеіць у гаражы, і сказаў: «Вось гэта клей! Трымае так, што і сабака не адарве!»

— Цудоўна! Твая мачыха папацее, пакуль гэтыя пацеркі адкалупае. Так ёй і трэба! — Калі справа была зроблена, Сцяпанка параіў: — Сукенку трэба схаваць дзе далей, каб не ўбачылі, пакуль ты да бабулі не паедзеш.

Яны занеслі яе ў кладоўку, дзе была рабочая вопратка, і закруцілі ў старую бацькаву куртку.

Назаўтра раніцай Алеська села ў аўтобус, які ішоў да Зацішанцаў. На правай шчочцы ў яе быў крывавы пісяг — пакаранне за тое, што недапільнавала куранят. Праз акно дзяўчынка памахала рукой Сцяпанку і прыклала да вуснаў пальчык. Гэта азначала: хавай нашу таямніцу. Ён з сур`ёзным выглядам сталага чалавека таксама закрыў далонькай рот...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

За беларускую мову на "Еўрабачанні-2017"!

У Беларусі ідзе акцыя «Я за беларускую мову на Еўрабачанні-2017» пад хэштэгам у інтэрнэце #naviband #04naviband. Яе сэнс заключаецца ў тым, каб падтрымаць гурт NAVI, які адзіны з усіх 13 удзельнікаў выступае з беларускамоўнай песняй.

Гурт NAVI

У 2016 годзе NAVI таксама спрабавалі прайсці на "Еўрабачанне", былі галоўнымі фаварытамі, але дзіўным чынам у фінале перамог і "поехал представлять Белоруссию" малавядомы ў Беларусі спявак IVAN, пратэжэ вядомага расейскага прадзюсара Віктара Дробыша. Вось як у інтэрв`ю карэспандэнту "Газеты Слонімскай" год таму на гэты конт выказаліся вакалісты гурта NAVI Ксенія Жук і Арцём Лук`яненка:

— Вы не прайшлі на "Еўрабачанне". Як ваш настрой пасля гэтага? Ходзіць шмат чутак, што там усё было куплена?

Арцём: Мы не хочам абмяркоўваць, што там было куплена. Галоўнае, што мы сумленныя ў адносінах да сабе і тых людзей, для якіх мы ўсё гэта робім. Мы ні ў якім выпадку не расстроіліся, што не прайшлі, магчыма, проста нам яшчэ рана туды. А тая падтрымка, якая зыходзіла ад нашых прыхільнікаў, нас вельмі натхніла. Таксама вельмі парадавала падтрымка людзей, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў працэсе адбору на "Еўрабачанне", як, напрыклад, таго ж Дзяніса Кур`яна, які напісаў нам, што мы лепшыя.

Ксенія: І Аня Шаркунова, і Каця Самсонава з радыё "Юністар" нас падтрымалі, і Хлястоў са сваім мэнеджарам акцыю ў інстаграме зладзілі.

Арцём: І Павел Якубовіч, галоўны рэдактар "СБ", выказаў падтрымку. Прыемная падтрымка такіх людзей. Гэта для нас паказчык.

І вось праз год музыкі зноў спрабуюць прабіцца на гэты вядомы ва ўсім свеце конкурс, каб выступіць ад Беларусі і каб наша мова загучала на ўвесь свет.

— Мы больш хвалюемся за наш новы альбом, які выйдзе у гэты ж дзень! — сказала карэспандэнту "ГС" пра настрой гурта перад адборам Ксенія Жук.

Фінал нацыянальнага адборачнага тура адбудзецца 20 студзеня ў 22:00 і будзе ісці ў жывым эфіры на канале "Беларусь 1". Гурт NAVI (NAVIBAND) будзе выступаць пад №4 з беларускамоўнай песняй «Гісторыя майго жыцця». Фінал "Еўрабачання-2017" адбудзецца 13 траўня ў Кіеве.

Мікіта ПАСТУХОЎ

Разгадай кроссворд и выиграй пиццу!



1. Калі пыл на баране, дык і … на рэшаце. **2.** Багаты … беднаму брату не рад. **3.** Даў бы траяка на … , ды сабе патрэбен. **4.** Хай … дзівіцца, чым бядак жывіцца. **5.** Не кожная … нясецца, каторая сакоча. **6.** … на елі, а мы яшчэ не елі. **7.** Як п'ян дык … , а як праспіцца — свінні баіцца. **8.** Што … , то і гаварок, што сяльцо, то і слаўцо. **9.** Толькі і гора пану, што … баліць. **10.** … свежы добры да ежы. **11.** Старому печ, а маладому … . **12.** Хвалі … ў стагу, а пана ў грабу. **13.** Папаўся, як … ў шапку. **14.** З панства найгоршае … . **15.** Не гаспадар, калі … у павеце гуляе. **16.** Ксёндз і … знаюць, калі свята, бо нічога не робяць. **17.** … адна і тая не людна. **18.** І … не мыўся, і госць з'явіўся. **19.** Гультай і злодзей — … родныя браты. **20.** … , што дышла: куды павярнуў, туды і выйшла. **21.** Кабыла з ваўком цягалася — … да грыва асталася. **22.** Дзе поп царкву ставіць, там … карчму ладзіць. **23.** Авечку стрыгуць, а … дзівіцца. **24.** Кожны … сваю стрэльбу хваліць. **25.** Каваль куе — жонка пяе, … шые — жонка вые. **26.** Калі … пяе, то мужыка трасца трасе. **27.** Але ж і старанная! Як … ідуць, то веніка шукае хату падмесці. **28.** Заварыўшы кашы, не шкадуй … . **29.** Любіць, як … сляпую кабылу. **30.** … не па лесе, а па людзях ходзіць. **31.** Сляпы сляпому не … . **32.** З малой крыніцы вялікая … пачынаецца. **33.** Вялікі, як дуб, а дурны, як … . **34.** Дзе … нарадзіла, там і радзіма. **35.** Дзяўчыне … , а карове смерць. **36.** І добры … з гора дурнем зробіцца: ён і нясмелы, ён і няўмелы.

SMS-ответы принимаются на номер 8 029 133-04-21 с 8:00 20 января до 20:00 22 января

Победителем станет наш читатель, чьё SMS-сообщение с правильным ответом придет 10-м по счету!

Победитель получит в подарок купон на бесплатную пиццу от кафе "101 этаж".

Если ответов будет меньше 10, победителем будет считаться участник, приславший ответ последним (до указанного времени).

С одного номера принимается только одно сообщение.

*Победное SMS-сообщение со словом-паролем «легенда» на кроссворд в №2 было получено в пятницу, 13 января, в 9:10 с номера **+375 29 38xxx00.** Всего было прислано 64 ответа.*

НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ

Дарья Правдицкая
(победитель конкурса в №1):
— В этом конкурсе победила во второй раз, а в моей семье это уже пятая выигранная пицца. В одном SMS-сообщении я послала ответы на два кроссворда. Их разгадываем вместе с бабушкой.

Разгадай кроссворд и выиграй стрижку!

Гитарист из «Кипелова»	Группа Кинчева	Шведская рок-группа	Англ. мореход	Восток	100 кв. м	Арабский бубен
1 2 8	5 3	6	4 9	7		10

Волнорез	Кадка	Форма яйца	Штирлиц, фамилия	Льдина в торосах	Урожай с луга	Ад у эллинов

ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

СЛОВО-ПАРОЛЬ (1) (2) (3) (4) (5) (6) (7) (8) (9) (10)

SMS-ответы принимаются на номер 8 029 133-04-21 с 8:00 20 января до 10:00 23 января

Победителем станет наш читатель, чье SMS-сообщение с правильным ответом придет 20-м по счету. Победитель получит купон на бесплатную стрижку в парикмахерской "Империя". Если ответов будет меньше 20, победителем будет считаться участник, приславший ответ последним (до указанного времени). С одного телефонного номера принимается 1 сообщение.

НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ

Людмила Хвесеня
(победительница в №1):
— Выиграла купон на стрижку во второй раз. Правда, в парикмахерской пока не стриглись. Участвуем и в других конкурсах, но почему-то везет только в этом.

*Победное SMS-сообщение со словом-паролем "альтанка" на кроссворд в №2 было получено в воскресенье, 15 января, в 16:51 с номера **+375 29 58xxx21**. Всего было прислано 36 ответов.*

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Мікіта ПАСТУХОЎ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Ганна ВАРАНОВІЧ
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: 8 (01562) 29-999,
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
Velcom: 8-029-133-04-21
Skype — gazslon
(9.00-18.00)

Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com
© «Газета Слонімская»
Спасылка на «ГС» абавязковая

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Людміла ЕМЯЛЬЯНАВА
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Прыём аб'яў і падпіска:
аўторак-субота з 9.00 да 18.00, абед з 13.00 да 14.00,
выхадны — нядзеля і панядзелак
8-(044) 762-48-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў адказваюць асабіста за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі. Рэдакцыя не вядзе перапіскі з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Сделайте селфи номера!

Хотите увидеть себя на первой полосе "ГС"?

Спешите прислать ваше селфи в новую рубрику «Газеты Слонимской» «Селфи номера»!

Лучшее селфи будет напечатано на первой полосе «ГС».

Присылайте ваши фотографии-селфи на электронный адрес vitaliy-slonim@mail.ru. С одного электронного адреса можно высылать только одну фотографию.

Авторы лучших селфи по итогам месяца будут приятно удивлены.

Поздравляем с днём рождения!

Иван Яновский
23 января исполнится 13 лет



Егор Потоцкий
23 января исполнится 6 лет

Уважаемые читатели!

В рубрике «Поздравляем с днём рождения!» мы поздравим вашего ребенка бесплатно!

Приносите или присылайте нам фото своих любимых чад (в конверте по адресу: 231800, РБ, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, 41 или на электронный адрес anna@gs.by).

В письме обязательно укажите имя и фамилию именинника, дату его рождения и возраст.

Вложите в своё письмо чистый конверт с маркой и вашим адресом, чтобы мы могли выслать фото обратно. **Ждем фото именинников!**

ПОГОДА на неделю

www.meteoprog.by

	утро	день	вечер
СРЕДА, **18 января**	-9⁰	-4⁰	-10⁰
ЧЕТВЕРГ, **19 января**	-12⁰	-7⁰	-7⁰
ПЯТНИЦА, **20 января**	-12⁰	-8⁰	-8⁰
СУББОТА, **21 января**	-5⁰	-2⁰	-2⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, **22 января**	-8⁰	-7⁰	-8⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, **23 января**	-11⁰	-8⁰	-8⁰
ВТОРНИК, **24 января**	-8⁰	-5⁰	-7⁰
СРЕДА, **25 января**	-5⁰	-2⁰	-3⁰

ПАЗНАЙ МЕСЦА І АТРЫМАЙ ПІЦУ!

Сябры, калі вы пазналі пабудову на фотаздымку, шліце SMS-паведамленне з адказам на нумар 8 029 133-04-21. Неабходна ўказаць назву ці адрас пабудовы — вуліцу і нумар.

Адказ на заданне ў №2: брацкая магіла, у якой пахаваны 103 воіны. Помнік у выглядзе санітарнай палаткі і сцяны з надпісам, вул. Гагарына

На заданне ў №2 прыйшло 7 адказаў, 1 з якіх быў няправільным. Пераможнае SMS-паведамленне было атрымана ў пятніцу, 13 студзеня, у 14:03 з нумара +375 29 91xxx19.

Адказы прымаюцца з 8:00 20 студзеня да 20:00 22 студзеня.

➢Пераможцам конкурсу стане наш чытач, адказ якога прыйдзе на тэлефон **10-м па ліку**!

➢Пераможца атрымае ў падарунак купон на бясплатную піцу ад рэстарана "Залаты Фенікс".

➢У выпадку, калі адказаў будзе менш чым 10, пераможцам будзе лічыцца ўдзельнік, чыё SMS-паведамленне будзе апошнім.

➢З аднаго тэлефоннага нумара прымаецца адзін адказ.

Паважаныя чытачы! Пры жаданні вы можаце дасылаць адказы на ўсе нашы конкурсы ў **АДНЫМ** SMS-паведамленні.

Нашы пераможцы

Барыс Бякасаў
(пераможца ў №1):

— У першы раз прыняў удзел у конкурсе — пазнаў на фотаздымку магазін на вуліцы Даватара. А наогул у нашай сям'і гэта не першы выйгрыш, мы ўжо згубілі лік выйграным піцам.

Жанна ІВАНОВА
ФОТА АЎТАРА

«Давай познакомимся»

Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

На сайт «ГС» можно зайти с помощью QR-кода с мобильного устройства

Заснавальнік Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП «Газета Слонимская» ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by, gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Тыраж 3 500

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)

Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 17 студзеня 2017 года 16:00.

Аб'ём — пяць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП «Гродзенская друкарня» г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.

Заказ № 277